нию дружбы между странами [5, 1127–1139]. Беларусь активно участвует в строительстве «Один пояс – один путь» и имеет большой потенциал для развития туризма с Китаем [6, 70–73].

Изучив публикации на трех языках по исследуемой проблеме (китайском, английском и русском), автор пришел к выводу, что теоретическое изучение туристической дипломатии значительно отстает от современного развития мирового туризма и требует более глубокого научного осмысления и обсуждения.

**Литература**


1. 2015 г. нянь цюань го лу ю гун цзо хуэй и бао гао = Отчет о Национальной конференции по туризму [Электронный ресурс] // Жэньминь жибао онлайн. – Режим доступа: http://travel.people.com.cn/GB/139035/392369/index.html. – Дата доступа: 24.10.2020.
2. Го ву юань гуань ю инь фа» ши сан ву» лу ю е фа чжань гуй хуа де тонг чжи = Уведомление Госсовета КНР о выпуске «13-й пятилетки»; план развития туризма [Электронный ресурс] // портал китайского правительства. – Режим доступа: http://www.gov.cn/gongbao/content/2017/content_5160220.htm. – Дата доступа: 24.10.2020.
3. Тунлуо, Цзоу. Лу ю вай цзяо ю го цзя син сян чуань бо = Туристическая дипломатия и общенациональная имидж-коммуникация / Цзоу Тунлуо, Ху Инь // Сибирские исследования. – 2016. – № 5. – С. 22–24.
4. Becken, S. Does tourism lead to peace? Annals of Tourism Research / S. Becken, F. Carmignani // Annals. – 2016. – P. 61, 63–79.
5. Ефремова, М. В. Анализ развития международного туризма между Россией и Китаем / М. В. Ефремова, О. В. Чкалова, Би Жуй // Экон. анализ: теория и практика. – 2017. – Т. 16. – № 6. – С. 1127–1139.
6. Олюнина, И. В. Развитие сотрудничества Беларуси и Китая в сфере туризма: современное состояние / И. В. Олюнина // София. – 2018. – № 2. – С. 70–73.


## Маджарскія – стваральнікі слуцкіх паясоў


*Макоўская Я. У., аспірант БДУ,*
*навук. кір. Брыгадзін П. І., д-р. гіст. навук, прафесар*


Слуцкія паясы занялі сваё пачэснае месца ў матэрыяльнай і духоўнай спадчыне Рэспублікі Беларусь, набылі вядомасць за яе межамі. Сёння яны захоўваюцца і экспануюцца ў вядомых музеях нашай і суседняй краін, уваходзяць у прыватныя калекцыі і зборы. Хто ж з’яўляецца ідэйным распрацоўшчыкам слуцкага пояса?

Слуцкі пояс атрымаў сваю назву ад беларускага горада Слуцка, дзе ў другой палове XVIII ст. дзейнічала тэкстыльная мануфактура. Гэтыя часы характарызуюцца модай на нашэнне персідскіх паясоў, якія часта каштавалі неверагодна вялікіх грошай. Каб знізіць выдаткі на гэтую неабходную частку гардэроба, тагачасны Нясвіжскі ардэнат Міхал Казімір Радзівіл Рыбанька засноўвае асабістае прадпрыемства па вытворчасці паясоў [1].

Кіраваць Слуцкай мануфактурай быў запрошаны майстр Станіслаўскай ткацкай «фабрыкі» зараз вядомы нам пад імем Яна Маджарскага. Ёсць меркаванне, што менавіта ён прывёз спецыяльны ткацкі станок, а суадносна і тэхналогію вытворчасці шаўковых паясоў на нашыя землі з украінскіх тэкстыльных мануфактур у Станіславе і Бродах.

Біяграфічных звестак аб родзе Маджарскіх да нас дайшло мала. Хутчэй за ўсё Ян Маджарскі (магчымае сапраўднае імя Аванэс Маджаранц) нарадзіўся ў Стамбуле ці яго ваколіцах у сям'і венгра Нума і армянкі Луцыі. Дзе Аванэс набыў такія добрыя веды і вопыт у галіне ткацтва дакладна не вядома. Самай верагоднай з'яўляецца тэорыя аб яго працы ў армянскіх ткачоў Якуба Піятровіча і Эвона Мікановіча, якія трымалі майстэрні ў прадмесцях Стамбула [2, 23].

Дакладна вядома, што ў 1750-я гг. ён ужо працаваў у Станіславе (сучасны ўкраінскі горад Івана-Франкоўск) у якасці высокакваліфікаванага спецыяліста, а ў 1758 г. быў запрошаны на працу да Радзівілаў, дзе так добра паказаў сябе, што з 1760 г. стаў узначальваць створаную слуцкую персіярню [2, 25].

Заснавальніку роду Маджарскіх удалося не толькі наладзіць працу мануфактуры Радзівілаў, але і дасягнуць значных поспехаў у выпрацоўцы знешняга выгляду галоўных вырабаў прадпрыемста. Паясы, вырабляемые на Слуцкай мануфактуры, былі карацейшымі (3–4 метра замест 4–5) і вузейшымі (28–36 сантыметраў замест 70–80) у адрознінне ад іх персідскіх аналагаў. Яшчэ адной навацыяй стала яго «чатырохбаковасць». Спецыяльная тэхналогія вытворчасці дазваляла ткаць пояс такім чынам, што абодва яго бакі можна было выкарыстоўваць як ліцавыя. Да таго ж кожны бок яшчэ падзяляўся на дзве паловы, якія таксама мелі розны знешні выгляд. Кампазіцыйна слуцкі пояс дзяліўся на тры часткі – два прамавугольных завяршэння на канцах (галовы) і асноўная частка (сярэднік). Маджарскі дадаў да гэтай кампазіцыі махры – шаўковыя кісці, што надала Слуцкаму поясу завершаны выгляд.

Ян Маджарскі настолькі якасна арганізаваў працу на прадпрыемстве, што ў 1776 г. Радзівілы аддаюць слуцкую мануфактуру яму ў арэнду. Не апошнім фактарам у прыняцці такога рашэння былі матэрыяльныя складанасці сям'і Радзівілаў, якую ў той час узначальваў «сапраўдны сармат» Караль Станіслаў

(Пане Каханку). Па падпісанай дамове Маджарскі атрымліваў у сваё поўнае распараджэнне слуцкую фабрыку тэрмінам на 1 год, за што павінен быў плаціць 10 тысяч злотых. Дамова штогод заключалася ізноў [1].

Яшчэ пры жыцці Яна фабрыка была перададзена яго сыну Леону (Лявону), які падпісваў дамову аб арэндзе за 1778 г. ужо ад свайго імя. Хутчэй за ўсё, ён нарадзіўся ў 1740-я гг. у Стамбуле, а ў 1760-я пераехаў да бацькі ў Рэч Паспалітую. Яму давялося ўзначальваць мануфактуру да 1807 г. [2, 54]. Палітычнае і эканамічнае становішча на беларускіх землях у XIX ст. не садзейнічалі далейшай дзейнасці персіярні і, неўзабаве, яна зачынілася.

У Лявона Маджарскага былі сыны Антон і Ян, аднак ні яны, ні іх дзеці ткацтвам не займаліся. Па мужчынскай лініі род неўзабаве згас, дзяўчаты выходзілі замуж і мянялі прозвішча. Напрыклад, унучка Лявона Альжбета выйшла замуж за мясцовага шляхціца Часлава Манюшку. У іх нарадзіўся сын Станіслаў, які стаў вядомым музыкантам і кампазітарам [3].

Ян і Леон Маджарскія былі ўзнагароджаныя ў 1790-я гг., атрымаўшы набілітацыю пад гербам «Дар» [2, 54].

Ян Маджарскі памірае ў 1800 г., Лявон – у 1811-м. Абодва былі ўрачыста пахаваны ў слуцкім бернардзінскім кляштары Святога Антонія [4, 52].

**Литература**

1. История слуцких поясов [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://belpoiasa.blogspot.com. – Дата доступа: 03.11.2020.

2. Лазука, Б. А. Слуцкія паясы і еўрапейскі тэкстыль XVIII стагоддзя. Малы лексікон / Б. А. Лазука. – Мінск : Беларусь, 2015. – 172 с.

3. Успамін пра слуцкую персіярню [Электроны рэсурс] / І. Ціткоўскі. – Слуцк, 2014. – Рэжым доступу: https://kurjer.info. – Дата доступу: 03.11.2020.

4. Скворцова, И. Н. Историческая судьба слуцкого пояса из Комайского костела / И. Н. Скворцова // Мастацкая адукацыя і культура: штоквартальны навукова-метадычны часопіс. – 2011. – № 2. – С. 50–54.

## Специфика двусторонних отношений Аргентины и СССР в период с 1946 г. до установления власти военной хунты 1976 г.

*Максименко А. Д., студ. II к. БГУ,*
*науч. рук. Лашкевич С. А., канд. ист. наук, доцент*

Исследуя специфику взаимоотношений двух стран, всегда можно выделить некие отличительные черты, причины для развития сотрудничества в рассматриваемый период. В данной работе хотелось бы проанализировать